ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987

14 МАЯ

ЧАЦВЕР

№ 17(1538)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

*«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»*

### ТУРЗЛЁТ

удзельнікаў Усесаюзнага паходу па рэвалюцыйных і баявых мясцінах славы савецкага народа адбыўся нядаўна ў Лаўскім лесе (Уздзенскі раён). Яго ўдзельнікі спаборнічалі ў ваенізаванай эстафеце, спартыўным арыентаванні, турпаласе, валейбольных і футбольных гульнях. На першае месца выйшла каманда юрыдычнага, на другое — біялагічнага, на трэцяе — радыёфізічнага факультэтаў.

Для мясцовых жыхароў быў дадзены святочны канцэрт.

С. БАЛАШЭНКА.

### «ПАГАВОРЫМ ПРА МУЗЫКУ»

— такая тэма маладзёжнага вечара, у праграме якога «музычны рынг» і дыскатэка. На «рынг» будуць запрошаны рок-групы «Близнецы», «7 герц», «Хоя», вакальны дуэт (МРТІ). Вечар адбудзецца 20 мая ў Палацы чыгуначнікаў. Білеты можна набыць у камітэце камсамола (306 пакой галоўнага корпуса).

А. САМУЙЛІЧ.

### СЕННЯ

можна без запрашальнага білета трапіць на канцэрт польскіх сяброў — танцавальнага ансамбля «Шлёнск». Пачатак у 14.30 у актавай зале.

Ж. КРУГЛІКАВА.

### КЛУБ «ПАЛІТЫКУС»

запрашае на чарговае пасяджэнне аматараў палітычнай дыскусіі. Тэма пасяджэння «Вынікі работы XII з'езда кампартыі Грэцыі».

Пачатак у 20.00, як заўсёды, у кафэ «Гаўдэамус».

Т. РУДКОЎСКАЯ.

### СПІД

— злейшая чума чалавецтва. Пра гэтае захворванне пойдзе гутарка ў актавай зале БДУ 19 мая. (Пачнецца ў 17.30). За білетамі звяртацца ў прафком.

А. САЎЧЫК.

### КНІЖНЫ КІРМАШ

для аматараў беларускай кнігі пачне працаваць у суботу, 16 мая, на плошчы Якуба Коласа. Тут вы зможаце набыць новыя кнігі беларускіх празаікаў, паэтаў, драматургаў, творы класікаў роднай літаратуры і кнігі замежных пісьменнікаў у перакладзе на беларускую мову, аформіць падпіску на зборы твораў У. Караткевіча, П. Броўкі, Ц. Гартнага, К. Чорнага, К. Кірыенкі, У. Карпава, заказаць кнігі будучага года.

Адбудзецца сустрэча з супрацоўнікамі выдавецтва «Мастацкая літаратура». Пройдзе прэм'ера кніг Я. Янішчыц «Каліна зімы», У. Паўлава «Выбраныя творы ў 2-х тамах», М. Мятліцкага «Ружа вятроў».

Вы таксама зможаце пазнаёміцца з выстаўкай кніжнай графікі і кніг-лаўрэатаў Усесаюзнага і рэспубліканскага конкурсаў «Мастацтва кнігі». Пачнецца кірмаш ў 11 гадзін.

С. ДАШЧЫНСКАЯ,
рэдактар аддзела прапаганды кнігі Мінаблкнігагандлю.

## *аўтарытэт студэнта*



*Аўтарытэт чалавека... На чым ён грунтуецца? На асабістай абаяльнасці, патрабавальнасці ці бездакорным выкананні сваіх абавязкаў? Хутчэй за ўсё і на тым, і на другім. Валя Савіцкая ў прафбюро геафака адказвае за арганізацыйны сектар. Працуе яна, як лічаць і студэнты, і выкладчыкі, выдатна. Акрамя гэтага, яна вельмі сумленная, кожнаму гатова дапамагчы, нешта параіць, актыўна ўдзельнічае ва ўсіх факультэцкіх мерапрыемствах, спявае ў вакальнай групе. Хіба гэтага мала, каб заваяваць аўтарытэт таварышаў?*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

## *вышэйшая школа: шляхі перабудовы*

# ЗА ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

Людзі ўсіх прафесій сёння ставяць перад сабой пытанне: тваё месца ў агульнанароднай перабудове? Гэта пытанне стаіць і перад намі — тымі, хто выхоўвае журналісцкія кадры.

За 43 гады існавання факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна яго скончыла больш як 3 тысячы чалавек. Выпускнікі журфака працуюць у шматтыражных, раённых, абласных і рэспубліканскіх газетах, на радыё і тэлебачанні, у выдавецтвах. Сярод яго выхаванцаў нямала паэтаў і пісьменнікаў.

Сёння 90 працэнтаў рэдакцый газет, радыё, тэлебачання БССР укамплектаваны спецыялістамі з вышэйшай адукацыяй. Гэта самы высокі паказчык сярод рэспублік нашай краіны. Сапраўды, у падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў мы набылі пэўны вопыт. Але зрабіць трэба будзе яшчэ больш.

У кім сёння маюць патрэбу рэдакцыі газет, радыё, тэлебачання? У творча думаючых, добра пішучых людзях. А што яны нярэдка атрымліваюць? Рознае атрымліваюць. І аб'ядноўвае гэта рознае адно — непрыстасаванасць да практычнай работы. А калі студэнту — будучаму журналісту — авалодваць адпаведнымі навыкамі? Даводзіцца канстатаваць той сумны факт, што толькі адзінкі з нашых выхаванцаў настаянна супрацоўнічаюць

*(Заканчэнне на 3-й стар.).*

## *да вынікаў агляду-конкурсу газет*

Радыёфізікі і хімікі, пэўна, зусім закруціліся са сваімі справамі, што на насценку забыліся і ў камітэтах камсамола факультэтаў, і ў рэдкалегіях. А ў выніку — камісія агляду-конкурсу насценнага друку так і не ўбачыла іх газет. Сумна было пачынаць сваю работу з «нулікаў», але прыйшлося іх паставіць радыёфізічнаму і хімічнаму факультэтам.

# Як падрасці насценцы?

КОНКУРС насценак праводзіцца штогод напярэдадні Дня друку. Апошнія гады месцы ў выніковай табліцы мяняюцца факультэтамі з цяжкасцю. На жаль, прыйшлося канстатаваць камісіі, што конкурсу як такога не было. Мяркуйце самі: што гэта за конкурс, у якім з 11 факультэцкіх газет фактычна могуць спрачацца за высокія месцы 3—4 газеты?

Спрэчку за першае месца вялі «па традыцыі» «Журналіст» і «Vita». Журфакаўскую і біяфакаўскую газеты адрозніваюць добрае тэхнічнае афармленне, ілюстраванасць, крытычна-праблемны змест, высокая інфармацыйная насычанасць кожнага нумара. Журфаку ўдалося ў другі раз запар стаць пераможцам агляду-конкурсу. Але біёлагі ўступілі пераможцам з розніцай толькі ў адзін голас.

Прыемна парадавала насценгазета юрыстаў «Савецкі юрыст». Яе афармленне, змест прыкметна палепшыліся, і ў выніку — III месца. Каб цікавей было афармленне ў фізікаў, трошкі баявей выступленні, пэўна ж, іх газета «За навуку» магла б падняцца вышэй IV месца.

Цяжка было рэцэнзаваць насценкі геаграфічнага («Мерыдыян»), механіка-матэматычнага («Рошым любую задачу») — гэтыя газеты падзялілі 7—8 месцы — і асабліва гістарычнага («Гісторык» — IX месца) факультэтаў. Хутчэй за ўсе яны нагадвалі піянерскі ўзрост. Ды і то, пэўна, у некаторых піянераў газеты лепшыя. Добра, што на геафаку і гістфаку любяць прастор, шырыню і размах, але ж гэта яшчэ не прычына для таго, каб марна выкарыстоўваць газетную плошчу.

У насценцы журфака ў кожным нумары змяшчаецца 35—40 матэрыялаў. Не заклікаю ўсіх рабіць такую вялікую газету. Але ж, таварышы дарагія, малая інфармацыйная насычанасць нумара — гэта ж велізарны мінус газеце. Няўжо за месяц (такая перыядычнасць насценкі) у географаў і гісторыкаў нічога не адбываецца, пра што варта расказаць, яшчэ раз успомніць? Сумняваюся я вельмі ў гэтым.

Што галоўнае ў газеце: змест ці афармленне? Ідэальны варыянт, калі і з адным, і з другім будзе ўсё ў парадку. Але ж...

Нявытрыманасць афармлення «Слова філолага» адцягвае ўвагу. Цікавыя знаходкі ў афармленні газеты ёсць у юрыстаў, але змест часам жадае лепшага. Наогул, усім насценкам не хапае крытычнасці, праблематычнасці.

Так, для выпускнікоў усіх 10 факультэтаў, акрамя адзінаццатага — журфака, газета будзе толькі як грамадская работа. Але ж і грамадскую работу неабходна рабіць сумленна. Ці не так?

Нядаўна адбыўся «круглы стол» прэс-цэнтра камітэта камсамола. Гаворка ішла і пра насценны друк. Хочацца верыць, што выказаныя камісіяй заўвагі рэдкалегіі ўлічаць, і праз год мы зможам гаварыць аб прафесіяналізме ў выпуску насценгазет не толькі біёлагаў і журналістаў. І конкурс стане сапраўдным конкурсам, калі ўсё будуць вырашаць сотыя балаў...

С. ГОГАЛЬ,
член камісіі агляду-конкурсу насценнага друку, кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

*з юбілеем!*

# ШЧЫРАСЦЬ ДУШЫ І ТАЛЕНТУ

**СЕННЯ СПАЎНЯЕЦЦА 80 ГОД ВЫДАТНАМУ САВЕЦКАМУ МАТЭМАТЫКУ, ЛАЎРЭАТУ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ СССР, АКАДЭМІКУ АН БССР, ГЕРОЮ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ МІКАЛАЮ ПАЎЛАВІЧУ ЯРУГІНУ.**

Мікалай Паўлавіч нарадзіўся ў станіцы Вялікакняжаскай (цяпер г. Пралетарск Растоўскай вобласці). У 1928 годзе ён паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Ленінградскага універсітэта, а ў 1932 годзе стаў аспірантам кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў. Вызначаючы ўплыў на фарміраванне навуковых інтарэсаў маладога М. П. Яругіна ў той час аказалі М. Е. Кочын, М. М. Гюнтэр, а таксама С. М. Бернштэйн і У. І. Смірноў.

Малады таленавіты даследчык у адпаведнасці з традыцыямі ленінградскай матэматычнай школы звяртаецца да адной з вузлавых і складаных праблем тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў — праблемы Пуанкарэ ў ірэгулярным выпадку. У 1935 годзе М. П. Яругін спачатку прапанаваў рашэнне гэтай праблемы для сістэм двух ураўненняў, а праз два гады даў поўнае яе рашэнне для сістэмы ўраўненняў любога парадку і на гэтую тэму абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны М. П. Яругін закончыў работу над вядомай праблемай Рымана аб сувязі паказчыкаў разгалінавання рашэнняў і матрыц каэфіцыентаў сістэмы дыферэнцыяльных ураўненняў для выпадку трох асобных кропак на канечнай адлегласці. У той жа час ён атрымаў шэраг глыбокіх рэзультатаў па праблеме Смірнова-Собалева аб пабудове функцыянальна - інварыянтных рашэнняў хвалевага ўраўнення, якія потым ініцыіравалі многія даследаванні ва ўказаным напрамку.

З першых дзён вайны Мікалай Паўлавіч — на перадавой, ён камандуе ўзводам супрацьтанкавай 45-міліметровай артылерыі. Пасля 150 дзён бесперапыннага знаходжання ў баявой ахове і ў блізкіх баях за г. Ленінград М. П. Яругін 22 лютага 1942 года быў цяжка паранены. Праз 7 месяцаў лячэння ў шпіталях М. П. Яругін (яшчэ ў цяжкім становішчы) прыбыў у г. Елабугу на Каме, дзе ў той час знаходзіўся філіял Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта, і приступіў да актыўнай навуковай дзейнасці.

Тут, усяго праз некалькі месяцаў, Мікалай Паўлавіч атрымаў выдатны рэзультат: ім была вырашана пастаўленая яшчэ ў 1880 годзе А. М. Ляпуновым задача аб пабудове прыводзімых сістэм. Гэта праца лягла ў аснову яго доктарскай дысертацыі, бліскуча абароненай летам 1943 года ў Казані.

У хуткім часе пасля абароны доктарскай дысертацыі М. П. Яругін зацвярджаецца прафесарам і загадчыкам кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў Ленінградскага універсітэта.

У Ленінградзе М. П. Яругін пачынае вялікую серыю прац па тэорыі ўстойлівасці, якаснай, аналітычнай і агульнай тэорыі звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў, па ўраўненнях у прыватных вытворных і па зваротных задачах дынамікі. Гэтыя працы прывялі да стварэння вялікай навуковай школы. У ленінградскі перыяд дзейнасці (1946—1956 гг.) пад кіраўніцтвам М. П. Яругіна абаранілі дысертацыі 15 яго вучняў, прычым чацвёра з іх у гэты ж перыяд становяцца доктарамі. Адначасова М. П. Яругін вядзе вялікую навукова-арганізацыйную работу. Ён — дэкан матэматыка-механічнага факультэта Ленінградскага універсітэта, дырэктар Ленінградскага аддзялення Матэматычнага інстытута імя У. А. Сцяклова АН СССР.



У 1951 годзе за выдатныя працы па тэорыі ўстойлівасці і па праблемах кіравання Мікалаю Паўлавічу Яругіну прысуджаецца Дзяржаўная прэмія СССР.

У 1956 годзе Мікалай Паўлавіч выбіраецца акадэмікам АН БССР і пераязджае на работу ў Мінск. Тут пад непасрэдным кіраўніцтвам і пад прамым яго ўплывам абаронена некалькі дзесяткаў кандыдацкіх і 9 доктарскіх дысертацый, створана беларуская школа па дыферэнцыяльных ураўненнях, арганізаваны і вырас ў буйную навуковую ўстанову Інстытут матэматыкі АН БССР, адкрыты і выдаецца усесаюзны часопіс «Дыферэнцыяльныя ўраўненні», які карыстаецца шырокай папулярнасцю як у СССР, так і за мяжой. З 1956 па 1972 гг. М. П. Яругін з'яўляўся загадчыкам кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Ён адзін са стваральнікаў факультэта прыкладной матэматыкі.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за выдатную навуковую і арганізацыйную дзейнасць Мікалаю Паўлавічу Яругіну ў 1969 годзе прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. У 1977 годзе за вялікія заслугі ў навуцы і ў арганізацыі вышэйшай адукацыі М. П. Яругін узнагароджваецца ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

У 1982 годзе Мікалай Паўлавіч завяршае цыкл сваіх прац па праблеме Рымана выданнем фундаментальнай манаграфіі «Праблема Рымана».

Характэрнай рысай навуковых прац М. П. Яругіна з'яўляецца не толькі атрыманне глыбокіх і фундаментальных рэзультатаў. У іх закладваюцца ідэі і прынцыпы, якія вызначаюць характар і шляхі развіцця навуковых даследаванняў на многія дзесяцігоддзі.

Шматбаковую навуковую і навукова-арганізацыйную работу М. П. Яругін пастаянна спалучае з вялікай грамадска-палітычнай дзейнасцю. Ен выбіраўся дэлегатам XXIV з'езда КПСС, XXVII з'езда КПБ, з'яўляецца членам Нацыянальнага камітэта савецкіх матэматыкаў.

Заслугі Мікалая Паўлавіча Яругіна атрымалі высокую ацэнку Радзімы. Ён — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны дзеяч навукі БССР, Герой Сацыялістычнай Працы, узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны І і ІІ ступені і многімі медалямі.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна добра ведаюць, любяць і цэняць Мікалая Паўлавіча, на яго прыкладзе выхоўваецца студэнцтва. Шчырасць душы і сэрца, трывалыя карані, закладзеныя Мікалаем Паўлавічам, прыносяць значныя рэзультаты — шырыцца атрад яго вучняў, беларуская школа па дыферэнцыяльных ураўненнях атрымала сусветнае прызнанне.

Ад усяго прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнцтва універсітэта, вучняў хочацца пажадаць Мікалаю Паўлавічу Яругіну добрага здароўя і новых здзяйсненняў на ніве айчыннай навукі.

**М. ЮРЧУК,**
сакратар парткома
універсітэта, доктар
фізіка-матэматычных навук,
прафесар.

*трывога: чалавек за бортам!*

# ШЛАГБАУМ... ЗАХАПЛЕННЯ

ЧАМУ ЎСЕ Ж ЁН ПАКІДАЕ УНІВЕРСІТЭТ?

РАЗМАЎЛЯЮ З МНОГІМІ ЛЮДЗЬМІ. САКРАТАР КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, СТАРШЫНЯ ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАЙ КАМІСІІ, ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТА, ЯГО НАМЕСНІК, ВЫКЛАДЧЫКІ, СТУДЭНТЫ. УСЕ ЯНЫ СТАВЯЦЦА ДА ЯГО ПА-РОЗНАМУ. І МЕРКАВАННІ ІХ, ШТО СЛОВЫ ПЕСНІ Ў ВЫКАНАННІ НЯЎДАЛАГА ХОРУ: ЗДАЕЦЦА, ПРА АДНО І ТОЕ Ж, АЛЕ БЕЗ СУГУЧНАСЦІ.

«ЁН МОГ БЫ СТАЦЬ ВЫДАТНЫМ ПРАГРАМІСТАМ»,— ЛІЧАЦЬ НА КАФЕДРЫ ЛІЧБАВЫХ МЕТАДАЎ І ПРАГРАМІРАВАННЯ.

«ЗАЛАТАЯ ГАЛАВА»,— ЗГАДЖАЮЦЦА І Ў КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА.

«НААГУЛ, АД ЯГО ПРЫСУТНАСЦІ ФАКУЛЬТЭТУ НІ ГОРАЧА, НІ ХОЛАДНА, АЛЕ ХЛОПЦА ШКАДА»,— ЗАПЭЎНІВАЮЦЬ У ДЭКАНАЦЕ.

СЛУХАЮ. ЗАПІСВАЮ, РАЮСЯ, СПРАЧАЮСЯ. А МЯНЕ ЎСЕ НЕ АДПУСКАЕ ПЫТАННЕ: ЧАМУ ЎСЕ Ж ЁН ПАКІДАЕ УНІВЕРСІТЭТ?

«**УСЮ СВАЮ** ўвагу сканцэнтроўвае на вывучэнні аднаго прадмета, у якім праяўляе выдатныя здольнасці». (Характарыстыка. Падпісана камсоргам, праформ і старастам. Складалася для разгляду справы на персанальнай камісіі).

Аднойчы нехта са знаёмых заўважыў, што не ўяўляе сабе Славу (назавем нашага героя так) па-за дысплейным класам. (Не дзіва: мяне таксама накіроўвалі ў гэты славуты 414 пакой — маўляў, Слава там кожную вольную, а часцей за ўсе адарваную ад заняткаў хвіліну праводзіць). Слава ж тады толькі ўсміхнуўся, падзівіўшыся чалавечай наіўнасці, і, зразумела, не стаў успамінаць гісторыю пра сваё знаёмства з праграміраваннем.

Дакладна не помніць, калі, але яшчэ ў школе пачаў апантана займацца матэматыкай. І факультэт не выпадкова абраў так, каб пасля заканчэння ўсё жыццё побач з ёю быць. Адзінае, што яго палохала — неабходнасць вывучэння курса праграміравання. Так было, пакуль не зазірнуў ён у дысплейны клас суседняга факультэта (у іх у той час аб такім толькі марылі). Машыны спачатку не спадабаліся: халодныя і маўклівыя. Куды больш прыемна было мець справу з лічбамі, што ўзнікаюць на дошцы ці ў сшытку. Сярод іх ён адчуваў сябе сваім.

Пасля азнаямленчай экскурсіі апынуўся ў дысплейным класе раз-другі. І за нейкія два-тры месяцы сам не заўважыў, як «захварэў» праграміраваннем. Калі вымяраць па звычайных мерках, то было гэта не так ужо і даўно — трохі больш года таму назад. Калі ж падлічыць яго «машынны час», страчаны непасрэдна ў дысплейным класе, дома — над стварэннем праграм, на перапынках — пры праверцы «раздрукоўак» сяброў, думаю, неверагодных памераў лічба атрымаецца. За яе, за гэтую лічбу, якая ўключае ў сябе немалую колькасць вучэбных гадзін, на другім курсе атрымаў вымову за пропускі заняткаў без уважлівых прычын.

А потым, пасля таго як у зімовую сесію на ІІІ курсе атрымаў нездавальняючыя адзнакі, вучэбна-выхаваўчая камісія пачала хадайнічаць перад камітэтам камсамола аб вынясенні строгай вымовы з занясеннем у картку за халатныя адносіны да вучобы. Члены вучэбна-выхаваўчай камісіі — людзі на факультэце паважаныя. Пры разглядзе пытанняў аб непаспяваючых імкнуцца зрабіць дакладны разбор прычын адставання. Таму камітэт камсамола (дарэчы, большасць яго членаў таксама прысутнічалі) рашэнне камісіі падтрымаў і перадаў справу на разгляд у персанальную камісію універсітэта.

«Паспяхова займаецца навуковай работай на кафедры лічбавых метадаў і праграміравання. Карыстаецца аўтарытэтам у выкладчыкаў і студэнтаў. Актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці факультэта і групы...» (З характарыстыкі).

Дзіўная справа атрымалася: навуковай работай чалавек паспяхова займаецца, у вывучэнні аднаго прадмета праяўляе выдатныя здольнасці, а па астатніх, непасрэдна звязаных з праграміраваннем, мае запазычанасці. На пасяджэнні вучэбна-выхаваўчай камісіі дрэнную паспяховасць ён растлумачваў тым, што ў мінулым семестры шмат часу ахвяраваў рабоце ў дысплейным класе, не звяртаючы ўвагі на іншыя прадметы.

Тое, што часу на ўсё астатняе ў яго не хапае, Слава зразумеў не адразу. Работа захапляла. Да таго ж, з'явіўся ўжо нейкі вопыт. Да Славы звярталіся за дапамогай — на факультэце складаліся легенды пра яго здольнасці як праграміста. Адразу пасля заняткаў спяшаўся ў дысплейны клас, не з'яўляўся на семінары і залікі з той нагоды, што ў кагосьці «ну, ніяк не атрымлівалася праграма». Не было свабодных машын — ён ехаў на другі канец горада ў дысплейныя класы радыётэхнічнага інстытута.

Прыйшоў час паставіць кропку і паразважаць наконт таго, якой павінна быць дапамога: шчырай і безадказнай або карыслівай і той, пра якую гавораць — «у разумных межах». «Справа не ў тым, каму я дапамагаў і чым займаўся, калі прапускаў заняткі, справа ў вучобе маёй»,— скажа пасля Слава на пасяджэнні персанальнай камісіі.

А мне чамусьці стане крыўдна за яго, таленавітага праграміста, які растрачвае свае сілы на асоб, што выпадкова апынуліся на факультэце і трывала асталяваліся там дзякуючы вось такой безадмоўнай дапамозе. Ён вырашыў пакінуць універсітэт, а іх сумленне так і не прачнецца за пяць год вучобы і, як мне здаецца, за ўсе жыццё.




І ўсё ж карыслівай яго дапамога была. Так, адмаўляць ён ніколі не мог. І не толькі па «дабрыні душэўнай». Яшчэ і таму, што самому гэтая справа падабалася больш лекцый па іншых дысцыплінах. Хаця, працуючы над складаннем чужых праграм, ён адчуваў недахоп ведаў. І тады браў у рукі вучэбны дапаможнік, самастойна ўнікаў у сутнасць прадмета. Затрачваў на гэта больш часу, але калі не разумеў усё да канца, нічым іншым займацца не мог.

«Слава — знаходка нашага факультэта, не толькі студэнты, але і выкладчыкі часам звяртаюцца да яго за парадай. І ў той жа час ён «вольны казак», для якога не існуе слова «трэба». (Іна, сакратар камсамольскай арганізацыі, якая разам з членамі вучэбна-выхаваўчай камісіі ўжо доўгі час змагаецца за тое, каб Славу не выключалі з універсітэта, таму што лічыць: «Каму ж на факультэце вучыцца, калі не апантанаму праграмісту і здольнаму матэматыку?»).

У некаторых пытаннях ён сапраўды лепей за выкладчыкаў разбіраецца. Калі дысплейны клас яшчэ толькі пачынаў сваё існаванне на факультэце, Слава ўжо добра валодаў тэхнічнымі навыкамі і дапамагаў усталяваць і асвоіць машыны. Праўда, аб гэтым на факультэце многія ўжо паспелі забыцца. І існуе сярод выкладчыкаў такое меркаванне, што не ўспрымае Слава праграміраванне ўсур'ёз: так, гульня цікавая, ёй дзіця і цешыцца, толькі чамусьці выкарыстоўвае для гэтага вучэбныя дысплеі, перашкаджаючы правядзенню заняткаў.

«Яму падабаецца, ён захапляецца справай і, зразумела, наогул ні на што іншае не звяртае ўвагі» (Інжынер Валодзя працуе на факультэце нядаўна, але паспеў заўважыць, што часцей за ўсё машынны час Слава растрачвае на разблытванне лічбавых памылак тых, хто звяртаецца за дапамогай).

Наогул, работа за дысплеем не з'яўляецца для яго толькі асабістай справай. Ніякіх дапа-

*вiншуем!*

# Па працы — і гонар

**Друкарня БДУ імя У. І. Леніна ўзнагароджана пераходным Чырвоным сцягам МінВНУ СССР і ЦК галіновага прафсаюза.**

*КАЛЕКТЫЎ друкарні універсітэта, нягледзячы на складанасці, адчуваючы недахоп вытворчых плошчаў, працаваў рытмічна і ўпэўнена, выконваючы датэрмінова планавыя і сацыялістычныя абавязацельствы.*

*Хочацца пералічыць тых, хто сваёй працай, сваім актыўным удзелам у агульнай справе прынёс поспех роднаму калектыву. Гэта ветэраны працы, настаўнікі моладзі, якія аддалі вытворчасці 15—20 і болей гадоў,— Н. Ф. Алькіна, У. М. Гарбачоў, А. К. Якушава, Л. Д. Шульгіна, Г. У. Барташэвіч, З. К. Мотуз, Т. М. Баяровіч, Л. С. Паўлюць, В. К. Андрушэнкаў, В. А. Другаль, Я. А. Вашкевіч і многія іншыя. Нельга не назваць і маладых — наборшчыцу Лілію Пугачову, друкара Наталлю Казлоўскую. Яны і многія іншыя складаюць «залаты фонд» друкарні БДУ. Трэба спадзявацца, што і далей ветэраны і моладзь будуць імкнуцца да новых перамог.*

**Фота Г. ЮРЧАНКІ.**





# ЗА ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

*вышэйшая школа: шляхі перабудовы*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

у рэдакцыйных калектывах. У чым жа справа? А ў тым, што, як гаварылася ў Асноўных напрамках перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, «у навучальным працэсе ўпор робіцца на расшырэнне аб'ёму вывучаемага матэрыялу, што прыводзіць да перагрузкі навучэнцаў, наносіць урон развіццю навыкаў самастойнага творчага мыслення». Сапраўды, паглядзіце на пералік дысцыплін навучальнага плана. Чаго тут толькі няма! Журналісцкія дысцыпліны, праблематыка газетных, радыё-, тэлевыступленняў вельмі націснуты. Так, самастойнай работы — вось чаго не хапае сёння студэнту журфака. Будзе такая работа — будзе глеба для сапраўднага творчага ўзаемадзеяння з сапраўднымі журналістамі. А пакуль трэба прызнаць: не вельмі часта пачуеш на журфаку спрэчкі, дыскусіі вакол уласных матэрыялаў. Маса карысных звестак паведамляецца на лекцыях, часцей за ўсё яны ніяк не адлюстроўваюцца на практыцы.

Зразумела, усё гэта патрабуе сапраўднай перабудовы, а не касметычнай карэкціроўкі навучальных планаў. Задача — «стварыць у студэнцкіх калектывах абстаноўку напружанай барацьбы за веды» — больш чым актуальная для факультэта журналістыкі. Каб разам з дыпломным сачыненнем на тэарэтычную тэму кожны выпускнік мог пакласці на стол дзяржкамісіі папку з уласнымі публікацыямі.

Выходзячы з гэтага, мы імкнёмся перабудаваць сваю работу. На факультэце падрыхтаван праект новага навучальнага плана, у якім мы пастараліся адлюстраваць патрабаванні сённяшняга дня, пераглядаем выкладанне спецкурсаў і спецсемінараў. Сёння мы больш актыўна пачалі працаваць над забеспячэннем сувязі тэарэтычнага навучання з журналісцкай практыкай, павышэннем творчай актыўнасці студэнтаў. Я маю на ўвазе лабараторныя заняткі па разнастайных курсах, разнастайныя віды практык, творчыя лабараторыі, творчыя курсавыя і дыпломныя работы, навукова-творчыя гурткі і г. д. Аднак аддача ўсёй гэтай работы не заўсёды такая, як нам хацелася б.

Не сакрэт: нярэдка ў нашых выпускнікоў не хапае грунтоўнай тэарэтычнай, метадалагічнай узброенасці, агульнафіласофскай культуры. Універсітэцкая адукацыя павінна ўзброіваць іх ведамі на ўзроўні заканамернасцей развіцця грамадства, яго разнастайных сфер, ведамі аб палітыцы КПСС і Савецкай дзяржавы, стратэгіяй журналісцкага пошуку. Вывучэнне грамадскіх і журналісцкіх дысцыплін па-новаму, з улікам патрабаванняў часу, заклікана вырашыць гэту праблему.

Падрыхтоўка журналісцкіх кадраў залежыць не толькі ад дзейнасці выкладчыкаў факультэта, але і ад іншых акалічнасцей.

Перашкаджаюць няправільныя адносіны да ролі ВНУ і рэдакцыі ў навучальным працэсе, штучная адарванасць іх адзін ад аднаго. І, як вынік,— адчужаныя адносіны да студэнта-практыка. Нават у першакурсніку некаторыя газетчыкі хацелі б бачыць амаль гатовага журналіста. Сутыкаючыся з такімі вось сітуацыямі, разумею: і тут таксама спрацаваў стэрэатып «хай вучаць ВНУ, а ў рэдакцыі працуюць». Студэнт жа застаецца ў пройгрышы. Ён недабірае тых прафесіянальных ведаў, якія можа атрымаць толькі ў рэдакцыі.

І яшчэ аб адным. У 1975 годзе была прынята пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў». У ёй называўся шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне ўсёй справы падрыхтоўкі работнікаў друку, радыё і тэлебачання. Было прадугледжана значнае паляпшэнне матэрыяльнай базы факультэтаў і аддзяленняў. Але ў асноўным гэта засталося на паперы. Што датычыць факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна, дык тут матэрыяльная база навучання не толькі не палепшылася, а, наадварот, значна пагоршылася. Тут нават перастала выдавацца вучэбная газета «Журналіст» з-за адсутнасці друкарні. А гэта ж асноўная база навучальнага працэсу!

Адмоўны ўплыў на якасць падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў зрабіла падзенне прэстыжнасці журналісцкай прафесіі, што супярэчыць аб'ектыўна ўзрослай ролі прэсы. Нельга не пагадзіцца з рэдактарам газеты «Советский Таймыр» В. Вараб'ёвым, які пісаў у восьмым нумары часопіса «Коммунист» за 1986 год: «З вокнаў нашай рэдакцыі відаць прычалы Дудзінскага марскога порта, дзе працуюць пяць былых нашых супрацоўнікаў, прафесіянальных журналістаў. Працуюць грузчыкамі, без стрэсаў і камандзіровак у тундру, яны зарабляюць у некалькі разоў больш, чым учарашнія іх таварышы па пяру. Да таго ж, паляпшэнне жыллёвых умоў, дзіцячы садзік і іншыя немалаважныя ў жыцці кожнага чалавека выгоды і паслугі для іх больш даступныя, чым для супрацоўнікаў газеты».

Па тых жа прычынах змянілі месца работы і многія выпускнікі нашага факультэта. Журналісцкая прафесія не можа трымацца на адным энтузіязме. Відаць, таму з году ў год зніжаецца конкурс на факультэты і аддзяленні журналістыкі.

Р. БУЛАЦКІ,
загадчык кафедры гісторыі журналістыкі,
доктар гістарычных навук,
прафесар.

можнікаў і метадычак на факультэце няма. Таму цяжкавата студэнтам авалодваць тэхнікай праграміравання. А калі побач «жывы» дапаможнік? Падышоў, растлумачыў, дапамог. Нават калі не просяць. Проста дзеля таго, каб не для цябе аднаго, а для ўсіх праграміраванне было такім жа простым, як дважды два...

«Ці ўдзельнічаў ён хоць раз у алімпіядах, навуковых канферэнцыях, конкурсе навуковых работ?! Нешта не памятаю. Мог бы быць спецыялістам. Сапраўдным. Мне здаецца, сам не жадае. Вось сфарміраваўся ў нас навукова-вытворчы атрад. Працуе на «Інтэграле». Яго ў спісах няма. Хаця каму, як не Славе, працаваць у такім атрадзе. І карысці, упэўнены, было б больш». (Намеснік дэкана).

Навуковай работай, праўда, не ў тым выглядзе, з якім мы звыкліся, ён усё ж займаецца. Існуе невялічкая ініцыятыўная група, якую ўзначальвае выкладчык Валерый Станіслававіч Раманчык. І ён, Слава, у гэтай групе нефармальны лідэр. Займаюцца распрацоўкай матэрыяльнага забеспячэння, робяць кароткія характарыстыкі праграм.

У дэканаце і не чулі аб распрацаванай імі метадычцы для пачынаючых займацца праграміраваннем (якой, па словах Славы, на суседнім факультэце ўжо карыстаюцца), не цікавяцца і маленькімі «вынаходніцтвамі», няхай пакуль выпадковымі і тэарэтычна не сфармуляванымі.

«Выкладчыкам, спрачацца не буду, яны можа і дапамагаюць. Толькі група не аформлена, а значыць, не існуе, няма ў яе і праграмы дзеяння. Ніхто не ведае, якіх вынікаў яны збіраюцца дасягнуць і ці можна сфармуляваць іх у выглядзе рацпрапановы... Адным словам, метадам «тыка» працуюць...». (Ігар Леанідавіч ажыўляецца, задаволены знойдзенай фармуліроўкай).

І зноў аказваецца Слава ў становішчы «вольнага казака». Сапраўды, канкрэтная праца ў выглядзе залікаў і экзаменаў, навукова-вытворчага атрада, заняткаў у тым ці іншым навукова-даследчым гуртку Славу мала цікавіць. Затое калі ішлі ў мінулым годзе дні факультэта, ён паспяваў быць і фатографам, і акцёрам, і самым актыўным удзельнікам. Нават зараз, калі ўжо збіраўся пакідаць факультэт, ён таксама прыйшоў на пасяджэнне і выконваў, і хваляваўся зноў, забыўшыся на ўсё астатняе. Адыграла ролю звычка ўдзельнічаць ва ўсім: хто, калі не я? Так. Але ёсць тлумачэнне: проста гэтая справа, як і праграміраванне, і тэатр, і самадзейная песня яму падабаецца. А да той жа самай вучобы — цікавасці, нават звычкі ўжо няма. Сам не заўважыў, як страціў жаданне вучыцца, захапіўшыся тым, што давалася лягчэй.

І ўсе ж члены камітэта камсамола змагаліся за тое, каб яго не выключылі з універсітэта. Не, яны не добрыя нянькі для гультаёў. Таму і зацвердзіў камітэт камсамола прапанову вучэбна-выхаваўчай камісіі аб вынясенні строгай вымовы з занясеннем у камсамольскую ўліковую картку. «Разумееш, нават за безадмоўнасць трэба выносіць пакаранне. Можна дапамагаць іншым і не забывацца аб сваёй асноўнай справе». (Света, старшыня вучэбна-выхаваўчай камісіі, з чым аб'ектыўным меркаваннем нельга не згадзіцца).

І я забываюся на прынятае некалькі дзён назад рашэнне аб абароне Славы ад суровых пакаранняў камітэта камсамола, вучэбна-выхаваўчай камісіі і дэканата, таму што разумею: тут усе змагаюцца за яго. Ёсць толькі адно выключэнне: сам Слава.

М. ЗАГОРСКАЯ,
наш кар.

*наша юрыдычная кансультацыя*

# ДАПАМОГА НА ДЗЯЦЕЙ

Забеспячэнне найбольш спрыяльных умоў для росту насельніцтва і выхавання падрастаючага пакалення — адна з задач сацыялістычнай дзяржавы. У нашай краіне для вырашэння гэтай сацыяльнай задачы прыняты шэраг нарматыўных актаў, у прыватнасці Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 25 верасня 1974 года «Аб увядзенні дапамогі на дзяцей малазабяспечаным сем'ям».

УКАЗАМ прадугледжана назначэнне штомесячнай дапамогі на дзяцей сем'ям, у якіх сярэдні штомесячны даход на члена сям'і не перавышае 50 рублёў. У адпаведнасці з Указам Савет Міністраў СССР зацвердзіў «Палажэнне аб парадку назначэння і выплаты дапамогі на дзяцей малазабяспечаным сем'ям».

Дапамога назначаецца і выплачваецца сем'ям навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, вучылішчаў, школ і курсаў па падрыхтоўцы кадраў, аспірантаў і клінічных ардынатараў. Пры гэтым неабходна выкананне дзвюх умоў: а) у сям'і павінны быць дзеці да васьмігадовага ўзросту; б) сярэдні сумесны даход у сям'і не павінен перавышаць 50 рублёў у месяц на аднаго члена сям'і. Зазначу, што студэнцкая сям'я, якая жыве сумесна з бацькамі, лічыцца самастойнай, асобнай, і пры разліку ўлічваюцца толькі яе даходы. Заробак, які быў атрыманы ў студэнцкім будаўнічым атрадзе, у даход сям'і не ўключаецца.

Дапамога назначаецца і выплачваецца маці па месцы яе вучобы ці работы. Калі маці не працуе і не вучыцца, дапамога назначаецца па месцы працы ці вучобы бацькі. У нашым універсітэце грашовую дапамогу на дзяцей атрымліваюць каля 170 сем'яў, штогод на гэта выдаткоўваецца больш як 20 тысяч рублёў.

Заяву аб назначэнні дапамогі падаюць адміністрацыі прадпрыемства ці ўстановы. Пры звяртанні неабходна пры сабе мець пашпарт. Да заявы неабходна прыкласці: даведку аб саставе сям'і, якую выдае ЖЭС, выканком мясцовага Савета для пражываючых у дамах на правах асабістай уласнасці, камендантам інтэрната; копію даведкі аб нараджэнні дзяцей (завяраецца ў дэканаце ці па месцы прыняцця заявы), даведку аб даходах кожнага з членаў сям'і за папярэдні год.

Дапамога назначаецца на дзяцей, якія не маюць васьмігадовага ўзросту, і выплачваецца ў памеры 12 рублёў у месяц.

У пачатку кожнага года неабходна звярнуцца за назначэннем дапамогі на бягучы год. Тым, хто атрымліваў дапамогу ў папярэднім годзе, яна назначаецца са студзеня бягучага года, незалежна ад месяца паўторнага звяртання.

У БДУ імя У. І. Леніна заявы на атрыманне дапамогі прымаюцца кожны другі і чацвёрты чацвер месяца з 14.00 да 15.30 у пакоі 29 бухгалтэрыі па вуліцы Бабруйскай, 7.

Г. БЯЛОВА,
выкладчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта.

## ТЫДЗЕНЬ САВЕЦКА-БАЛГАРСКАЙ ДРУЖБЫ

*мацаваць традыцыі*

РОЗНАБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ САВЕЦКІМ САЮЗАМ І НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ БАЛГАРЫЯЙ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПРЫКЛАДАМ ЯШЧЭ НЕБЫВАЛЫХ У ГІСТОРЫІ АДНОСІН ПАМІЖ ДЗЯРЖАВАМІ, ПА-САПРАЎДНАМУ СПРАВЯДЛІВЫХ, РАЎНАПРАЎНЫХ, БРАЦКІХ. ПАСТАЯННА РАЗВІВАЕЦЦА І ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА ІХ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў СФЕРЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ. СЯРОД ТРЫЦЦАЦІ САВЕЦКІХ І ДВАЦЦАЦІ БАЛГАРСКІХ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ АДНЫМ З ПЕРШЫХ ДАГАВОР АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ ЗАКЛЮЧЫЛІ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА І САФІЙСКІ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ К. АХРЫДСКАГА.

# УНІВЕРСІТЭТЫ-ПАБРАЦІМЫ

**ГЭТЫ ДАГАВОР,** падпісаны больш дваццаці гадоў назад, прадугледжвае аказанне ўзаемнай дапамогі ва ўдасканаленні вучэбнага працэсу, рэгулярны абмен прафесарамі і выкладчыкамі для педагагічнай працы і вывучэння новых форм і метадаў планавання і арганізацыі вучэбнай і выхаваўчай работы, сумесныя навуковыя даследаванні, падрыхтоўку навуковых кадраў, абмен студэнцкімі групамі для вытворча-азнаямленчай практыкі, узаемаабмен метадычнымі дапаможнікамі.

Беларускі універсітэт з'яўляецца важным цэнтрам падрыхтоўкі кадраў для НРБ. Яго скончыла больш як 50 балгарскіх юнакоў і дзяўчат. Звыш 15 балгарскіх аспірантаў паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

У апошнія гады найбольш эфектыўнай формай узаемадзеяння універсітэтаў-пабрацімаў стала сумесная распрацоўка навуковых даследаванняў, стварэнне інтэрнацыянальных калектываў, правядзенне сумесных эксперыментаў. У 1978—1980 гадах вялася работа па сямі агульных тэмах, у 1981—1985 — па дванаццаці актуальных праблемах фізікі, матэматыкі, біялогіі, геаграфіі, грамадскіх навук.

Напрыклад, вынікам сумеснага пошуку кафедр радыётэхнікі і фізічнай электронікі Беларускага і Сафійскага універсітэтаў з'яўляюцца атрыманыя аўтарскія пасведчанні і надрукаваныя дзесяткі артыкулаў, абароненыя кандыдацкія дысертацыі. Вытворчае ўкараненне толькі адной з навінак дазволіла атрымаць гадавы эканамічны эфект у памерах 120 тысяч рублёў.

Эфектыўна супрацоўнічаюць са сваімі балгарскімі калегамі члены кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, якія сумесна распрацоўваюць тэму «Супастаўляльнае даследаванне граматыкі беларускай і балгарскай моў». Былі праведзены тры сімпозіумы: «Беларуска-балгарскія моўныя сувязі» ў 1976 і 1982 гадах у Мінску і ў 1979 годзе — у Сафіі. Практычным рэзультатам даследавання з'явіцца выданне нарысаў супастаўляльнай граматыкі балгарскай і беларускай моў.

Гісторыкі Беларускага і Сафійскага універсітэтаў Д. Б. Мельцар і Й. Тончаў надрукавалі ў Мінску сумесную манаграфію «Нацыянальный свабодзе Балгарыі — 100 гадоў», а географы выдалі ў Сафіі кнігу «Беларусь».

Мабыць, не ўсім яшчэ вядома, што наш універсітэт з'яўляецца адным з вядучых цэнтраў балгарыстыкі ў краіне. Аб гісторыі і літаратуры Балгарыі можна даведацца, прачытаўшы дапаможнікі прафесара А. Я. Супруна і дацэнта А. М. Калюты «Уводзіны ў славянскую філалогію», дацэнта Б. Ю. Нормана «Балгарская мова», прафесара Н. С. Гілевіча «Верная вялікім запаветам (сучасная балгарская паэзія. 1956—1976 гады)».

Даўно стала традыцыяй правядзенне савецка-балгарскіх студэнцкіх навуковых канферэнцый. Цікава, што балгарыстыка займае ўсё большае месца не толькі ў навуковых работах, але і ў навучальным працэсе. Студэнтамі гістарычнага факультэта вывучаецца гісторыя Балгарыі, ім чытаюцца спецыяльныя курсы аб сацыялістычным будаўніцтве ў Балгарыі, гісторыі савецка-балгарскіх адносін, беларуска-балгарскіх гістарычных сувязях. На філалагічным факультэце выкладаюць балгарскую мову, гісторыю балгарскай літаратуры. Студэнты пішуць курсавыя і дыпломныя работы па балгарскай праблематыцы. Многія з іх атрымалі высокую ацэнку на рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах.

Яшчэ ў студзені 1969 года было створана аддзяленне Таварыства савецка-балгарскага сяброўства. З той пары было праведзена больш як 200 масавых мерапрыемстваў. Цыклы лекцый, кіналекторыі, віктарыны, прысвечаныя сацыялістычнай Балгарыі, выстаўкі аб дасягненнях балгарскага народа ў будаўніцтве сацыялізму, яго гісторыі і культуры, супрацоўніцтва з балгарскім зямляцтвам — усе гэта садзейнічае умацаванню сяброўскіх адносін паміж універсітэтамі-пабрацімамі.

А. ШАРАПА,
прарэктар па міжнародных сувязях.

*спадчына*

БЫЛО ГЭТА Ў ІХ СТАГОДДЗІ. КІРЫЛ І МЯФОДЗІЙ СТВАРЫЛІ СЛАВЯНСКУЮ ПІСЬМЕННАСЦЬ. ГІСТОРЫЯ РАСПАРАДЗІЛАСЯ ТАК, ШТО ІХ СПРАВА РАСКВІТНЕЛА ІМЕННА Ў БАЛГАРЫІ, ДЗЕ І НАРАДЗІЛАСЯ ЎСЛЕД ЗА ГРЭЧАСКАЙ І ЛАЦІНСКАЙ СЛАВЯНСКАЯ ЛІТАРАТУРНА-МОЎНАЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ.

# СВЯТА СВЕТЛАЕ І ЧЫСТАЕ

**З ТОЙ ПАРЫ** кожны год урачыста, з кветкамі і песняй аб адроджаным народзе, які ідзе ў светлае будучае па шляху навукі і асветы, пачынаецца ў Балгарыі 24 мая свята славянскай пісьменнасці і культуры.

Сучасная сацыялістычная Балгарыя свята шануе памяць аб асветніках. Дэмакратычныя традыцыі іх справы, нягледзячы на ўсе зменлівасці лёсу, заўсёды жылі ў народзе. Здзейснены пераход да бясплатнай агульнай сярэдняй адукацыі.

Хутка развіваецца перыядычны друк. Яго флагман — газета балгарскіх камуністаў «Работническо дело» выходзіць штодзённа тыражом 830 тысяч экземпляраў.

Шырока вядомы імёны сучасных балгарскіх пісьменнікаў Эміляна Станева, Дзімітра Дзімава, Дзімітра Талева, Андрэя Гуляшкага, Любаміра Леўчава, Мікалая Хайтава. У іх тысячы чытачоў і прыхільнікаў за межамі краіны.

Краіна гасцінна прымае ўдзельнікаў міжнародных фестываляў балета, палітычнай і эстраднай песні, класічнай музыкі. Праводзяцца і мясцовыя святы культуры, сярод якіх самым цікавым з'яўляецца фестываль гумару і сатыры ў Габраве, а таксама Свята ружы ў гарадах Даліны руж, фальклорныя фестывалі для груп мастацкай самадзейнасці.

Балгарскі народ — наследнік багатай старажытнай культуры. У спісах аб'ектаў з сусветным культурным значэннем, складзеным ЮНЕСКА, унесены Рыльскі манастыр, Скальныя цэркві ў вёсцы Іванава, Фракейскія грабніцы ў Казанлыку і вёсцы Свештары (апошняя адкрыта зусім нядаўна), запаведнікі «Пірын» і возера «Срэбырна», скальны рэльеф конніка ў Мадары, сярэдневяковыя жывапіс у Баянскай царкве.

Шматбаковыя культурныя сувязі паміж СССР і Балгарыяй, але больш за ўсё збліжае народы брацкіх краін тое, што яны карыстаюцца агульнай славянскай пісьменнасцю, якую стварылі вялікія браты Кірыл і Мяфодзій. Прыйдзе 24 мая, і зноў людзі панясуць іх партрэты, зноў прагучыць заклік: «Упеpад, народ мой адроджаны, у светлае будучае ідзі!»

КРАСІМІР ІВАНОЎ,
аспірант факультэта журналістыкі.

*давайце знаёміцца*

# Сцяг паэта

**НЯМНОГІХ** паэтаў у сусветнай літаратуры напаткаў падобны лёс. Усё яго жыццё было прысвечана барацьбе супраць найвялікшага зла нашага стагоддзя — фашызму. Яго паэзія, у якой гучыць непераможная вера ў тое, што «заўтра жыццё будзе цудоўным», была вогненным словам балгарскай рэвалюцыі і светлай надзеі, што для чалавецтва надыдзе жаданая і доўгачаканая вясна. Яго мара была здзейснена ў Краіне Саветаў.

Фашысты бязлітасна загубілі яго, але бессмяротнымі засталіся вапцараўская ўпэўненасць і вапцараўскія запаветы. Яны зрабіліся сцягам у барацьбе ўсіх зняволеных народаў свету. Таму не было ніводнага кутка на зямлі, дзе б яго вершы не запалілі полымя свабоды.

Яго паэзія даўно вядома беларускім чытачам. І кожнае новае пакаленне імкнецца быць прыналежным да чысціні яго ідэалаў.

Ці не доказ таму тое, што дваццацігадовыя студэнткі філалагічнага факультэта любяць балгарскага паэта Н. Вапцарава і шукаюць у яго вершах вечныя ісціны?

ГЕОРГІ ГЫРДЗЕЎ,
выкладчык балгарскай мовы ў БДУ

*Н. ВАПЦАРАЎ.*

Бязлітаснае, жорсткае змаганне,
*Змаганне празаічнае, як кажуць.*
*Я ўпаў. Замест мяне мой сябра ўстане.*
*Хто — я ці ён — не так ужо і важна.*

Расстрэл. Чарвяк магільны — следам...
*Як гэта проста і заканамерна.*
Ды нам з табой быць у віхурах, бедах,
Бо мы цябе, народ, любілі верна.

*Пераклад* ***МАРЫНЫ АБРАГІМОВІЧ.***

***ВЕСНА***

***Белая весна моя, заветная,***
***не прожитая еще, не бывшая,***
***в снах предутренних меня манившая,***
***ты приходишь в сумерках рассветных,***
***чуть касаясь тополиных веток.***

***Белая весна моя, заветная,***
***ты придешь с дождем и ураганом,***
***неспокойна, огненномятежна,***
***тысячам ты возвратишь надежды***
***и кровавые омоешь раны.***

***Как поется вольно в жите птицам!***
***На просторе весело летать им...***
***Будут люди радостно трудиться***
***и любить друг друга, словно братья.***

***Белая весна моя, заветная,***
***дай увидеть мне твое приветствие,***
***что всему дарует жизнь и радость,***
***дай твое увидеть только солнце —***
***на твоих погибну баррикадах!***

*Пераклад* ***СВЯТЛАНЫ МАХОЦІНАЙ.***

*дні факультэтаў*

# Так трымаць!

ДЗЕНЬ ДРУКУ СЕЛЕТА БЫЎ АСАБЛІВЫ: УСЯ КРАІНА І ПРАГРЭСІЎНАЕ ЧАЛАВЕЦТВА АДЗНАЧАЛІ ЯШЧЭ АДНО СВЯТА — СПОЎНІЛАСЯ 75 ГАДОЎ З ДНЯ ВЫХАДУ № 1 ГАЗЕТЫ «ПРАЎДА».

***З УЗНЯТЫМ НАСТРОЕМ** адзначалі свае прафесійнае свята і на факультэце журналістыкі. Дзверы факультэта былі адчынены для ўсіх, хто цікавіцца журналістыкай, для каго ўваходжанне ў яе пакуль яшчэ мара. На прэс-канферэнцыі абітурыенты сустрэліся з выкладчыкамі, выпускнікамі факультэта. Асаблівую цікавасць выклікала перабудова студэнцкага жыцця: актыўны ўдзел студэнтаў у рашэнні факультэцкіх спраў, авалоданне прынцыпамі самакіравання.*

*Працяг свята адбыўся ў Доме кіно. Тут былі прадстаўлены лепшыя нумары студэнцкай насценкі «Журналіст» за апошнія гады. Гэта — своеасаблівы летапіс студэнтаў факультэта журналістыкі, якія вучацца расказваць пра свае жыццё, падзеі, праблемы. Тут жа дэманстравалі свае кулінарнае майстэрства выкладчыкі.*



*Праграму канцэрта распачаў студэнцкі хор, выканаўшы «Наступленне вясны» Ф. Ліста. Запомнілася, напэўна, многім з прысутных у зале і выступленне Андрэя Шлега (III курс), які чытаў уласныя сатырычныя маналогі, выкананне студэнтамі міжнароднага аддзялення журналістыкі Эдмунам і Мамі рускай народнай песні, чытанне верша студэнтам з НДРЙ Аманам Раадам...*

*На вечары былі падведзены вынікі традыцыйнага конкурсу маладых журналістаў «Залатое пяро», пераможцамі якога выйшлі Т. Кулінковіч, К. Дубінская, Т. Бялькевіч, А. Драздоў.*



*А потым каля мемарыяльнай пліты, на месцы, дзе 26 мая 1942 года быў расстраляны фашыстамі член Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б, рэдактар першага нумара падпольнай газеты «Звязда», Герой Савецкага Саюза У. С. Амельянюк, адбыўся мітынг, прысвечаны памяці героя. На мітынгу выступілі камісар адной з груп Мінскага падполля П. М. Хмялеўскі і падпольшчыца М. А. Драздоўская.*

*Мінутай маўчання ўшанавалі ўдзельнікі мітынгу памяць журналіста — Героя Савецкага Саюза, усіх загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.*

*Н. ГУЛЕЙЧЫК.*

*НА ЗДЫМКАХ: імгненні дня факультэта журналістыкі.*

*Фота Т. ХАМІЦЭВІЧ.*





БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
Зак. 1581.
14 мая 1987 г.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОЙ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ.